# Слова Жыцця



Чэрвень 2013

«Калі, робячы дабро і пакутуючы, церпіце, гэта даспадобы Богу» *(1 П 2,20).*





Святы апостал Пётр тлумачыць сваім супольнасцям пра тое, на чым менавіта заснаваны сапраўдны дух Евангелля, спасылаючыся на дакладныя дзяржаўныя і асабістыя жыццёвыя сітуацыі іх членаў.



Тут ён звяртаецца да рабоў, якія навярнуліся да веры, і якія - як і ўсе рабы ў тым грамадстве, перажывалі - часам несправядліва - непаразуменні і крыўды.



У больш шырокім сэнсе, гэтыя словы звернутыя да ўсіх людзей, якія ў нейкім часе і месцы вымушаны пакутаваць з-за несправядлівасці і непаразумення з боку сваіх бліжніх, няхай бы гэта было начальства ці роўныя ім людзі.

«Калі, робячы дабро і пакутуючы, церпіце, гэта даспадобы Богу» *(1 П 2,20).*





постал раіць не паддавацца інстынктыўнай рэакцыі,
якая можа паўстаць у гэтай сітуацыі,
але пераймаць стаўленне Езуса.



Болей за тое, ён заклікае адказваць з любоўю,
і нават бачыць у гэтых цяжкасцях і непаразуменнях ласку,
гэта значыць тое, што дапускаецца Богам як магчымасць
прадставіць сведчанне сапраўднага хрысціянскага духу.



Робячы так, тыя, каго пераследуюць, могуць праз сваю любоў прывесці да Хрыста таксама і тых, хто іх не разумее.

«Калі, робячы дабро і пакутуючы, церпіце, гэта даспадобы Богу» *(1 П 2,20).*





Некаторыя людзі на падставе гэтых слоў альбо іншых падобных ім, хацелі б абвінаваціць хрысціянства ў падтрымцы празмернай павагі, якая закалыхвае сумленне, аслабляе актыўнасць у барацьбе з праявамі несправядлівасці.



Але гэта не так. Калі Езус вучыць нас любіць нават тых, хто не разумее нас і крыўдзіць, гэта не таму, што ён хоча зрабіць нас неадчувальнымі да несправядлівасці. Наадварот!



Ён робіць гэта, таму што ён хоча навучыць нас,
як пабудаваць па-сапраўднаму справядлівае грамадства.
Мы можам гэта зрабіць, распаўсюджваючы дух
сапраўднай любові і любячы першымі.

«Калі, робячы дабро і пакутуючы, церпіце, гэта даспадобы Богу» *(1 П 2,20).*





То як жа нам жыць Словам Жыцця ў гэтым месяцы?



Мы таксама можам сустрэцца з недахопам паразумення
і быць пакрыўджанымі ў многіх адносінах:
можам сутыкнуцца з недзелікатнасцю і нявецлівасцю,
несправядлівымі меркаваннямі, няўдзячнасцю, абразамі,
нейкімі па-сапраўднаму вялікімі крыўдамі.



То ва ўсіх гэтых сітуацыях мы павінны засведчыць пра любоў, якую Езус прынёс на зямлю, засведчыць для ўсіх, а значыць, і да тых, хто да нас ставіцца дрэнна.



Слова гэтага месяца кажа нам, каб мы, сапраўды
абараняючы справядлівасць і праўду, не забываліся,
што наш першы абавязак, як хрысціянаў, любіць бліжняга
свайго, гэта значыць займаць у адносінах да іх  паставу
такога разумення, прыняцця і міласэрнасці,
якія Езус займаў для нас.



Такім чынам, нават абараняючы нашыя прынцыпы, мы ніколі
не павінны разрываць нашыя кантакты з іншымі людзьмі
і ніколі не паддавацца спакусе схаваць крыўду ці помсту.



І паводзячы сябе так, як бы мы былі прыладаю для любові Езуса, мы тым самым зможам прынесці Бога нашым бліжнім.



**«Калі, робячы дабро і пакутуючы, церпіце, гэта даспадобы Богу»** *(1 П 2,20).*

Testo di Chiara Lubich, scritto nel 1990

Grafica Anna LolloGrafica Anna Lollo in collaborazione con don Placido D'Omina (Sicilia, Italia)

* * *

Il commento alla Parola di Vita è tradotto ogni mese in 96 lingue e idiomi, e raggiunge vari milioni di persone in tutto il mondo tramite stampa, radio, TV e via internet.

Per informazioni www.focolare.org

•

Questo PPS, in diverse lingue, è pubblicato su www.santuariosancalogero.org